83.3(4Бем)я721
Б43

# Беларуская літаратура




11

Рэпазіторый БарГУ

# Беларуская літаратура

Дапаможнік
для вучняў 11 класа агульнаадукацыйных устаноў
з беларускай і рускай мовамі навучання

Пад рэдакцыяй А. І. Бельскага, М. А. Тычыны

*Рэкамендавана Навукова-метадычнай установай
«Нацыянальны інстытут адукацыі»
Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь*

Рэпозиторий БарГУ

Мінск
«Адукацыя і выхаванне»
2009

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721
Б43

Аўтары: *А. І. Бельскі*, д-р філал. навук, прафесар; *А. І. Белая*, канд. пед. навук, дацэнт; *Д. Я. Бугаёў*, канд. філал. навук, прафесар; *П. В. Васючэнка*, канд. філал. навук, дацэнт; *Я. А. Гарадніцкі*, канд. філал. навук; *Л. М. Гарэлік*, канд. філал. навук; *С. У. Калядка*, канд. філал. навук; *Е. А. Лявонава*, канд. філал. навук, дацэнт; *М. А. Тычына*, д-р філал. навук; *Т. І. Шамякіна*, д-р філал. навук, прафесар

Рэцэнзенты: *С. Л. Гаранін*, канд. філал. навук, загадчык сектара даўняй беларускай літаратуры Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; *М. Ф. Шаўлоўская*, канд. філал. навук, дацэнт, член секцыі філалагічных дысцыплін Дзяржаўнай камісіі; *А. І. Савасцянік*, настаўнік беларускай мовы і літаратуры в/к СШ № 97 г. Мінска; *Н. У. Целяпун*, настаўнік беларускай мовы і літаратуры в/к гімназіі № 1 імя Ф. Скарыны г. Мінска

**Беларуская літаратура** : дапам. для вучняў 11-га кл.
Б43 агульнаадукац. устаноў з беларус. і рус. мовамі навучання / А. І. Бельскі [і інш.] ; пад рэд. А. І. Бельскага, М. А. Тычыны. — Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2009. — 248 с. : іл.
ISBN 978-985-471-320-5.

Раскрываюцца галоўныя тэндэнцыі развіцця нацыянальнага слоўнага мастацтва ў 60—90-я гады XX стагоддзя. Асноўная ўвага адведзена характарыстыцы беларускай літаратуры на сучасным этапе. Разглядаецца творчасць многіх вядомых пісьменнікаў, пачынаючы ад Івана Шамякіна і Васіля Быкава да Алеся Разанава і Аляксея Дударава.

Адрасуецца вучням агульнаадукацыйных школ, гімназій і ліцэяў, а таксама слухачам падрыхтоўчых аддзяленняў і курсаў, абітурыентам. Можа быць выкарыстаны навучэнцамі ўстаноў, якія забяспечваюць атрыманне сярэдняй спецыяльнай адукацыі.

УДК 821.161.3.09(075.3=161.3=161.1)
ББК 83.3(4Беи)я721

ISBN 978-985-471-320-5
© Афармленне. РУП «Выдавецтва "Адукацыя і выхаванне"», 2009

Рэпазіторый БарДУ

## *Дарагія сябры!*

Гэтая навучальная кніга створана ў адпаведнасці з дзеючай праграмай па беларускай літаратуры для XI класа агульнаадукацыйных устаноў.

У дапаможніку раскрываюцца заканамернасці і тэндэнцыі развіцця нацыянальнага слоўнага мастацтва ў другой палове XX — на пачатку XXI стагоддзя, галоўная ўвага пры гэтым адведзена разгляду літаратуры на сучасным этапе. Аналіз ідэйна-мастацкага зместу твораў беларускіх і замежных пісьменнікаў адбываецца з апорай на паняцці па тэорыі літаратуры, прадугледжаныя для засваення школьнай праграмай.

Кніга для вучняў напісана аўтарскім калектывам Беларускага дзяржаўнага універсітэта і Інстытута мовы і літаратуры імя Якуба Коласа і Янкі Купалы НАН Беларусі. У яго склад увайшлі вучоныя, якія добра вядомы сваімі арыгінальнымі даследаваннямі па гісторыі літаратуры і творчасці пэўных пісьменнікаў.

Аўтарамі асобных тэм з'яўляюцца: *А. І. Белая* («Георгій Марчук»), *А. І. Бельскі* («Іван Шамякін», «Рыгор Барадулін»), *Д. Я. Бугаёў* («Васіль Быкаў», «Іван Чыгрынаў»), *П. В. Васючэнка* («Іван Навуменка», «Аляксей Дудараў»), *Л. М. Гарэлік* («Ніл Гілевіч»), *С. У. Калядка* («Яўгенія Янішчыц»), *Е. А. Лявонава* («Эрнэст Хемінгуэй», «Генрых Бёль»), *М. А. Тычына* («Беларуская літаратура перыяду 1966—1985 гадоў»), *Т. І. Шамякіна* («Міхась Стральцоў»), *А. І. Бельскі, П. В. Васючэнка, Я. А. Гарадніцкі, М. А. Тычына* («Беларуская літаратура на сучасным этапе (з сярэдзіны 1980-х гадоў): паэзія, проза, драматургія»). Да асобных раздзелаў дапаможніка метадычнае забеспячэнне падрыхтаваў *А. І. Бельскі*.

Рэпазіторый БарДУ

# Георгій Марчук
## (нар. у 1947 г.)

## Звесткі пра жыццё і творчасць



Георгій Васільевіч Марчук нарадзіўся 1 студзеня 1947 года ў мястэчку Давыд-Гарадок Столінскага раёна Брэсцкай вобласці ў сям'і шаўца. Дзяцінства будучага пісьменніка было нялёгкім: ён рана асірацеў, зведаў голад і холад пасляваеннага часу, нястачы і крыўды.

Як адзначаў у адным з інтэрв'ю сам Г. Марчук, яго «малая радзіма Давыд-Гарадок — дзіўны горад творчых людзей — ад іканапісца і рамесніка да гандляра кветкамі». З гэтай прычыны, лічыць пісьменнік, і ў ім самім памкненне да творчасці выявілася вельмі рана. Ён успамінае: «Я вучыўся жангліраваць, наведваў танцавальны і драматычны гурткі, займаўся харавымі спевамі, маляваў, самастойна вучыўся фігурнаму катанню...» Для аднакласнікаў Георгій быў душой класа, на ім трымалася школьная самадзейнасць, і многія не сумняваліся, што ён стане выдатным артыстам. Пра гэта ж піша крытык і літаратуразнаўца Алесь Марціновіч: «...Перш чым узяцца за пяро, Георгій Марчук прайшоў багатую жыццёвую школу: рана застаўся без бацькоў, выхоўваўся ў бабулі. А скончыў сярэднюю школу — ...кім толькі ні хацелася стаць! І артыстам, і рэжысёрам, і філосафам. Нягледзячы на цяжкасці, не апускаў рук, не страчваў веры ў тое, што даможацца свайго». Аднак у характары хлопца былі рысы, якія ў многім прадвызначылі яго жыццёвы выбар на карысць літаратурнай творчасці: надзвычайная назіральнасць, выдатная памяць, учэпістая на каларытнае слова і сакавіты выраз.

У 1965 годзе будучы пісьменнік скончыў Давыд-Гарадоцкую сярэднюю школу № 2 і падаў дакументы ва Усесаюзны

Репозиторий БарГУ

інстытут кінематаграфіі ў Маскве, але спроба паступіць у гэтую ўстанову не мела поспеху. Ён вярнуўся на радзіму і пачаў працаваць. Ужо з самага пачатку яго дзейнасць была звязана з тэатральным, затым — з кінамастацтвам. Юнак нейкі час кіраваў у мясцовым клубе драматычным гуртком, затым быў інструктарам Столінскага раённага Дома культуры, нейкі час — мастацкім кіраўніком ансамбля.

З 1969 года Георгій Марчук жыве ў Мінску. Значная частка яго жыцця і дзейнасці звязана з кінастудыяй «Беларусьфільм». Спачатку ён — асістэнт рэжысёра, пасля, скончыўшы Беларускі тэатральна-мастацкі інстытут (1973) і Вышэйшыя курсы сцэнарыстаў і рэжысёраў у Маскве (1975—1977), працуе кінарэжысёрам, затым загадчыкам літаратурнай часткі Тэатра-студыі кінаакцёра пры гэтай жа кінастудыі. На працягу амаль сямі гадоў быў дырэктарам выдавецтва «Мастацкая літаратура», з 2003 года працаваў галоўным рэдактарам кінастудыі «Беларусьфільм». Цяпер Г. Марчук — сакратар Саюза пісьменнікаў Беларусі.

У творчай скарбонцы Г. Марчука прадстаўлены літаратурныя творы розных жанраў: восем раманаў, пяцьдзесят п'ес, сто навел, трыццаць казак, пяць кінасцэнарыяў, чатырыста афарызмаў. Таксама ён вядомы як тэатральны крытык і выдатны публіцыст. На пытанне «Калі б Вы не сталі пісьменнікам, то кім бы сталі?» Г. Марчук адказаў: «Толькі пісьменнікам». Выступаць у друку пачаў у юнацкім узросце. Яго мастацкія замалёўкі, гумарэскі друкаваліся ў столінскай раённай газеце «Навіны Палесся». Да эпічнай творчасці пісьменнік прыйшоў не адразу. У літаратуры дэбютаваў аднаактовай п'есай «Выкраданне Алёны» (1971), адзначанай прэміяй на рэспубліканскім конкурсе драматургічных твораў. Гэта быў удалы пачатак. Але Г. Марчук настойліва імкнуўся сказаць сваё слова і ў эпічным жанры. Раман «Крык на хутары» (1983) засведчыў, што ў беларускай прозе з'явілася новая творчая асоба са сваім колам тэм, бачаннем свету, арыгінальным мастацкім мысленнем.

Можна вызначыць у шэрагу іншых асноўную мастацкую задуму пісьменніка — «уславіць з сардэчнай цеплынёй правінцыю». Родныя мясціны ў раманах пісьменніка

Рэпазіторый БарДУ

лёгка ўгадваюцца ў мастацкай геаграфіі яго твораў. Так, мястэчка Нырча ў рамане «Крык на хутары» — не што іншае, як Давыд-Гарадок. Рэкі Гарынь і Прыпяць, мясцовыя ўрочышчы, суседнія вёскі выведзены пад сваімі назвамі. Жыццёвыя шляхі герояў праходзяць таксама праз Пінск, Брэст, Гродна, сумнавядомы лагер у Картуз-Бярозе. У рамане «Кветкі правінцыі» асабліва выразныя аўтабіяграфічныя моманты. Яго герой, местачковы хлапчук Алесь Доля, рана застаўся без маці і няпроста шукае сваю дарогу ў самастойнае жыццё. Аднайменны фільм, створаны па рамане паводле сцэнарыя аўтара, у 1996 годзе адзначаны Дзяржаўнай прэміяй Рэспублікі Беларусь.

## Навелы

Георгій Марчук здолеў сказаць сваё адметнае слова пра «малую радзіму» — беларускае Палессе з яго самабытным укладам жыцця, адметнымі звычаямі і традыцыямі. Шырокая, яркая натура палешука ўвабрала ў сябе ўсё шматграннае хараство і багацце роднага краю і знайшла паўнакроўнае адлюстраванне ў творах пісьменніка. Нездарма Г. Марчука называюць «палескім песняром». Крытыка справядліва адзначае, што героі яго твораў — яскравыя, каларытныя, з яркай нацыянальнай афарбоўкай. Звяртаючыся да гісторыі Палескага краю, пісьменнік імкнецца ўбачыць у характары свайго народа тыя рысы і якасці, якія робяць яго паўнапраўнай часткай агульначалавечай супольнасці. Творчасць Г. Марчука скіравана на абуджэнне і выхаванне ў чалавеку любові да ўсяго жывога, здольнасці спачуваць слабаму і пакрыўджанаму, абараніць дабро перад злом. Глыбокі сэнс набывае паняцце адданасці таму, што для чалавека найбольш блізкае і дарагое.

Адметным жанрам, у якім выступіў Г. Марчук, з'яўляецца навела-канон. Сам аўтар падае такое тлумачэнне слова «"канон" (ад грэчаскага "норма") — адна з форм песнапення, якая ўяўляе сабой дыялог паміж чытальнікам і хорам». Цыкл «Давыд-гарадоцкія каноны» ўключае наступныя творы: «Канон Богу», «Канон Гарыні», «Канон Хаце», «Канон Вуліцы», «Канон Агароду», «Канон Школе», «Канон

Рэпазіторый БарГУ

Ветру», «Канон Базару», «Канон Часу», «Канон Маці». Іх змест лягчэй асэнсаваць, калі разгледзець паняцце «канон» больш шырока. Паводле тлумачальнага слоўніка, *канон* — збор палажэнняў, якія носяць дагматычны характар, г. зн. непарушныя, непадлеглыя крытыцы. У пераносным сэнсе *канон* — гэта ўсё тое, што цвёрда ўстаноўлена, стала агульнапрынятым. Біблейскі канон складаюць кнігі Біблії, якія больш аўтарытэтныя за ўсе іншыя напісаныя крыніцы, даюць правілы як веры, так і жыцця. У навелах-канонах Г. Марчука канкрэтнае, побытавае таксама цесна звязана з сакральным, духоўным. Ён «прысвячае свае каноны самым дарагім мясцінам, самым блізкім людзям, самым цікавым і таму запамінальным момантам жыцця, самым важным паняццям-складнікам лёсу чалавека» (Алена Багамолава).

У навеле «Канон Гарыні» філасофскія развагі пераплятаюцца з аповедам пра жыццёвыя клопаты. Цесную сувязь людзей з ракою Г. Марчук падкрэслівае згадкай, што яна «ад дня існавання» перажыла «дзевяцьсот пяцьдзесят тысяч жыццяў гарадчукоў», і невядома, колькі яшчэ тысяч перажыве. Усходнія філосафы лічылі, што вада вартая таго, каб на яе глядзець. Але на Палессі гаспадару, хата якога стаіць ля ракі, спачуваюць, бо ён у заўсёдным клопаце, ці не знясе вада дом, ці не «з'есць» яго. Рака вызначае ўлюбёны занятак гарадчукоў. Амаль кожны з іх, хоць у душы, рыбак. Аматараў рыбнай лоўлі хапае нават сярод давыд-гарадоцкіх жанчын. Таму цяжка знайсці сям'ю, дзе б не любілі і не ўмелі адмыслова варыць юшку.

Рака, упэўнены Г. Марчук, з самага маленства не толькі ўмацоўвае фізічна, а і «выхоўвае, загартоўвае характар чалавека». Але пісьменнік раіць памятаць: яна «мае свой нораў, паказухі, дурноты не даруе». «Канон Гарыні» асобнымі мясцінамі асацыіруецца з біблейскім канонам, паводле якога ў пачатку стварэння свету нябёсы і зямля былі складзены Богам «з вады і вадою». А ў часы Ноя свет, затоплены вадою, загінуў. Адсюль вынікае і дабратворнасць, і небяспека, якую нясе Рака. Таму аўтар прызнае: «У... векавой барацьбе вады і сушы найчасцей перамагае вада». Усё даецца чалавеку на радасць, а каб належным чынам ацаніць яе, часам лёс пасылае і гора. Каб яно не прыйшло ад ракі, дзяцей змалку

Репозиторий БарГУ

засцерагаюць хадзіць па адным на бераг і не пускаюць без нагляду гуляць у лодкі. Па вялікім жа рахунку рака «добрая». Нездарма навела пачынаецца афарызмам: «Рака не чалавек, яна злоснай не бывае».

Ва ўспрыманні Гарыні Г. Марчуком адбіўся вопыт яго ўласнага дзяцінства. Прысутнасць ракі ў жыццёвай прасторы чалавека ўзбагачае яго разнастайнымі сувязямі з наваколлем, прыладамі працы, прадметамі ўжытку. З гэтым звязаны мастацкія сродкі, якімі пісьменнік малюе вобраз ракі. Сярод іх — параўнанні, эпітэты, метафары. Так, у святы дзень, прыняўшы асвечаныя ў царкве кветкі, шырокая гладзь Гарыні робіцца падобнай на Млечны Шлях. «Яна без лодкі, як гарод без кветак, — сцвярджае Г. Марчук. — Такое адчуванне, што маторныя лодкі яе раздражняюць, а вясло яна сама лашчыць». Рака, на думку пісьменніка, «памочніца», «ціхая гаспадыня горадка», але разам з тым і «сімвал вечнага жыцця», «таямніца», «райская асалода». І, безумоўна, вялікая гордасць: хто, акрамя гарадчукоў, пахваліцца такой прыгажуняй?!

З ракою звязана шмат прымет і павер'яў. Так, «у туманныя дні з моста моладзь з заміраннем сэрца кідае ў ваду камяні... Хто не пачуе гуку свайго каменя, у таго жаданні ў гэтым годзе не будуць здзяйсняцца».

Рака Гарынь як частка роднай прыроды задавальняе патрэбу беларуса-палешука не толькі ў штодзённым і матэрыяльным, але і ў высокім, таямнічым і прыгожым, схіляе да роздуму аб жыцці і яго хуткаплыннасці, дапамагае асэнсаваць кошт радасці і гора, повязь усяго, што існуе ў свеце, — ад жыццёвых клопатаў да вечных ісцін. Аднак Г. Марчук добра ведае стрыманую натуру сваіх землякоў, таму піша: да ракі ставяцца «паважна, як да старэйшай сястры. Яе някідкую прыгажосць ацэньваюць у сталым узросце, добра павандраваўшы па свеце і пабачыўшы шмат». У праўдзівасці гэтага сцвярджэння і пераконвае «Канон Гарыні». Калі звярнуцца да аўтарскага азначэння канона як дыялогу паміж чытальнікам і хорам, то якраз чытальнік — аўтар — і ёсць той сталы чалавек, мастак слова, а «хор» — тысячы і тысячы гарадчукоў, аблічча якіх адбіліся ў водах Гарыні.

Радзіма чалавека — гэта, сярод іншага, яго родны дом, вёска ці горад, іх вуліцы. Фарбы, гукі, пахі роднай вуліцы

Репозиторий БарГУ

па-майстэрску перададзены Г. Марчуком у «Каноне Вуліцы», які абавязаны свайму стварэнню і тым, што на першы погляд звычайная местачковая вуліца мае сваю «святасць».

Слова «вуліца» мнагазначнае. У прамым сэнсе гэта два рады дамоў у населеных пунктах з прасторай паміж імі для праходу і праезду, а таксама сама гэта прастора. У пераносным — «асяроддзе, што сваёй некультурнасцю, нявыхаванасцю дрэнна ўплывае на каго-небудзь». Сёння часта даецца негатыўная ацэнка ўплыву вуліцы на фарміраванне асобы. Як жа ацэньвае гэты ўплыў Г. Марчук? Разгледзім мастацкую адметнасць вобраза вуліцы, створанага празаікам.

Яго героі могуць знянацку разбіць каму-небудзь акно футбольным мячом, пагуляць у карты (тым больш што настаўнікі не ходзяць па ваду па гэтай незаасфальтаванай вуліцы...) ці паспаборнічаць, хто далей плюне. Або закурыць, каб не бачылі бацькі, ці пацікаваць увечары пад акном местачковай прыгажуні. Аднак уплывы «сваёй» вуліцы правераны мудрым жыццёвым вопытам усіх яе папярэдніх жыхароў. Можна пачуць, як «маці б'е свайго сямігадовага сына: "Нашто забіў жабу?.. А коб цябе так мучылі, га?.."». Аўтар ацэньвае не заўсёды ідэальныя ўчынкі сваіх герояў як уласцівую ўсім падлеткам «хваробу росту», своеасаблівую прышчэпку ад таго вялікага зла, якое можа падсцерагаць іх на чужых вуліцах. Г. Марчук звяртаецца да чытачоў з пераканаўчай просьбай: «Даруйце штодня адно аднаму дробныя грахі, каб яны не перараслі ў вялікія, недаравальныя».

Пісьменнік адзначае: «Надзвычай пашанцавала той вуліцы, па якой не ездзяць машыны». Увечары яна ператвараецца ў сапраўдны местачковы клуб, дзе збіраюцца пасля таго, як «усэ поробілі». І прастора цесна зліваецца з часам: ніхто не спяшаецца ў хату, бо «так не хочацца расставацца з пражытым днём». Дзеці часам засмучаюцца: «Божа, як мала быў на вуліцы! Які кароткі дзень!»

Але вуліца не простае месца пад адкрытым небам, у адрозненне ад памяшкання. І не толькі таму, што ў Давыд-Гарадку яна можа «ў сакавіцкія дні паводкі» надоўга ператварыцца ў канал. «На вуліцы ўпершыню бачыш зоры на небе і, гледзячы на іх, упершыню ўяўляеш зямлю планетай». Пад гэтымі зорамі, як выток Радзімы, — «свая вуліца,



Рэпазіторый БарДУ

толькі свая, самая родная». На сваёй вуліцы — свае правілы паводзін, на чужой іншыя. Да дзяўчат не са сваёй вуліцы хадзіць нельга, дазволена толькі танцаваць з імі. На іншых вуліцах ці каля клуба і пабіцца можна, а тут аднагодкаў не б'юць і не крыўдзяць. Вуліца навек запамінае мянушкі і прозвішчы, ад якіх не ратуюць ні ганаровыя званні, ні высокія пасады.

Досыць поўна перадае ідэю твора прыказка «Будзе і на нашай вуліцы свята». Г. Марчук паведамляе пра здаўна ўсталяваны звычай: «Гудзе ўся вуліца двойчы: калі на ёй вяселле і калі провады ў войска». Яскрава, зрокава наглядна апісваецца вясельная працэсія, якая поўніць вуліцу музыкай, смехам, выклікае ў старэйшых успаміны пра маладосць, а ў моладзі — жаданне кахаць і быць каханымі. Наймацнейшае жаданне аўтара і яго герояў — каб вайна больш ніколі не ступіла на мірную Вуліцу бязлітасным каваным ботам — абумовіла адметны падбор слоў у сказе: «Апошні ветэран апошняй вялікай вайны раптам зацягне і сваю “Кацюшу”». Небяспеку для Вуліцы Г. Марчук бачыць і ў тым, што нехта з мястэчковых хлопцаў можа страціць цікавасць да яе, падаўшыся ў далёкі свет, «да той пары, пакуль яго не вырвуць з горада тэлеграмай на пахаванне стогадовага дзеда, пра якога ён, прызнацца, і забыўся. Але гэта будзе пасля...» Пакуль што ў гэтага хлопца іншае жаданне: каб каханая дзяўчына хадзіла па яго вуліцы, не абмінала яго хаты.

У навеле ёсць адна незаўважная на першы погляд дэталь: «праз шчыліны ў плоце паўзе на вуліцу да сонца, не баючыся пылу, настурцыя». Яе можна растлумачыць так: галоўныя каштоўнасці чалавечага жыцця, асэнсаваныя чалавекам у дзяцінстве, у самім блізкім яго акружэнні, застаюцца непарушнымі ў далейшым складаным жыцці. Гэтая ўпэўненасць аўтара гучыць і ў фінале твора: «Патыхае сасной. На вуліцы будуюць новую хату... Не, не памрэ вуліца — родны сэрцу кут».

Самая адметная сярод назваў навел — **«Канон Базару»**, бо на першы погляд словы, якія яе складаюць, здаюцца несумяшчальнымі. Але паступова аўтарская задума робіцца ўсё больш зразумелай. Па-першае, нагадвае пісьменнік, Давыд-Гарадок як «мястэчка гандляроў, купцоў, дробных



Репозиторий БарГУ

купчыкаў, рамеснікаў жыве чаканнем базару і базарам». Нават на гербе гарадка ўбачыш торбы з таварам на лодцы. Па-другое, «базар» — своеасаблівы антонім да слова «адзінота». Г. Марчук паказвае і даказвае, што «на базары ўсім добра». Пісьменнік называе яго «вялікім пярэстым каляровым светам шчаслівых твараў». Усім зместам навелы аўтар пераканаўча даводзіць, што панурых, «ваўкаватых» людзей на гарадоцкім базары не бывае, як не бывае і будзённых базараў, усе святочныя. Не ходзяць туды толькі хворыя.

Героямі навелы з'яўляюцца ўсе: і хто прапануе купіць тавар, і хто толькі прыцэньваецца. Базар мае свае няпісаныя, але моцныя законы. Напрыклад, калі ты прыйшоў сюды, то павінен купіць нешта хоць на пяць капеек. Другое правіла: тое, што вынеслі на продаж, недатыкальнае. Таму дзяўчынасірата, якая гандлюе яблыкамі, не асмельваецца іх паспрабаваць нягледзячы на тое, што паспела выгаладацца. Таксама надзвычай дзейсны на базары прынцып — «чужое смачнейшае». Гэта відаць на прыкладзе пакупніка, які набыў клінок белага сыру, зусім выпусціўшы з-пад увагі, што дома ляжыць «пад гнётам» свой.

Георгій Марчук паказвае наяўнасць у палешукоў прадпрымальніцкай жылкі, якая не ўласціва для большасці беларусаў. Так, гандляр «нейкім незразумелым пачуццём» ведае: сёння яго тавар купяць. Базар нават мае своеасаблівы маркетынг: «калі не знойдзеш неабходнай табе рэчы — закажы, і назаўтра купец ранічкай прынясе яе табе дахаты». А калі чалавек купляе мяса, абавязкова атрымае даважку.

Здавалася б, базар не тое месца, якое фарміруе культуру паводзін. Аўтар, аднак, заўважае, што «няма такой моды — хадзіць па базары і курыць». Тых, хто злоўжывае алкаголем, тут таксама не сустрэнеш. Гэта не азначае, што пісьменнік робіць з мястэчковага базару ідэальную жыццёвую прастору. Яскравы штрых да гэтага — згадка пра вечна галоднага сабаку, на якога ніхто не звяртае ніякай увагі. Часам гарадчукі скардзяцца адзін аднаму на тое, што «на рубель нічога нельга купіць», іх засмучаюць кошты на газ, дровы, электрычнасць. Горка чытаць пра тое, што бабуля з унучкай, прадаючы яблыкі, зарабілі толькі на хлеб, а стары

Рэпазіторый БарДУ

каваль не збыў ніводнага з такіх жа старых, як сам, ужо абыржавелых цвікоў. І ўсё ж героі Г. Марчука не наракаюць на цяжкае жыццё, вераць, што, «мажліва, заўтра ім ды іншым пашанцуе больш». Базар надзяляе наведвальнікаў радасцю і надзеяй, кожнага ў сваёй меры. Свая яна нават у таго бяздомнага сабакі, які нарэшце атрымаў у поўнае валоданне апусцелую базарную плошчу. Таму набываюць асаблівае значэнне словы аўтара аб тым, што будзённых базараў у гарадку не бывае — усе святочныя. І сваё свята кожны чалавек носіць пры сабе. Асноўная думка навелы «Канон Базару» можа быць выказана ўжытай Г. Марчуком у іншай навеле, «Канон Хаце», народнай мудрасцю: «Не жыві ўныло, не жалей, шчо было, погадав, шчо будэ, беражы, шчо е».

Канон, прысвечаны школе, з пададзеных вышэй азначэнняў жанру ў большай ступені адпавядае значэнню «пахвала». Аўтар паказвае своеасаблівую сувязь паміж вуліцай, царквой і школай у жыцці чалавека. Ён піша: «Вуліца выяўляе таленты, школа садзейнічае іх развіццю». Царква натхняе занапалых духам вярнуцца на шлях дабрадзейнасці — школа рупіцца прывіць звычку да працы і прыстойнасці. Радзіма, духоўнасць, прыгажосць, гармонія, талерантнасць, самаадукацыя, сэнс жыцця і многія іншыя паняцці засвойваюцца вучнямі не толькі са слоў настаўнікаў, а і ў супольных з імі інтарэсах і занятках.

Апавядаючы пра школу, Г. Марчук дае магчымасць зірнуць на жыццё местачкоўцаў вачыма маладой пары настаўнікаў, якія прыехалі з усходу Беларусі: «адносна ладныя хаты», звычаі, норавы людзей, іх набожнасць, дзелавітасць. Адметнасцю характару і побыту бацькоў вызначаюцца іх адносіны да навучання дзяцей. Бацькі спакойныя, калі дзеці ў школе. Больш таго, яны лічаць, што вучоба — гэта першая работа, хай сабе і не аплачваецца. Г. Марчук адкрывае яшчэ адзін сакрэт: дарослыя гарадчукі перакананы, што не веды палягчаюць жыццё, а грошы, і толькі яны. Мусіць, таму і не ўся моладзь адразу задумваецца, навошта трэба хадзіць у школу. Жыццёвыя назіранні аўтара падказваюць яму: адны пераходзілі з класа ў клас у чаканні новага адкрыцця свету, іншыя — у чаканні першага

пацалунка. Таксама «ідуць, каб атрымаць адзнаку па прадмеце, быць усім разам у класе, на танцах, на ўборцы бульбы, буракоў, кукурузы альбо на святочнай дэманстрацыі, на канцэрце».

Ацэньваючы паводзіны школьнікаў і іх адносіны да вучобы, Г. Марчук імкнецца быць аб'ектыўным і праўдзівым. Ён сыходзіць з таго, што «дзеці ўсюды аднолькавыя: цікаўныя, гарэзлівыя, непаслухмяныя і добрыя. Цікаўнасць пераходзіць у веды, рухавасць — у самадысцыпліну, непаслухмянасць — у годнасць». Неўзабаве ў арсенале вучняў з'яўляюцца новыя паняцці, якія вымушаюць цікавіцца іх сутнасцю, задаваць пытанні. Пісьменнік падкрэслівае, што самым важным у навучанні з'яўляецца ўласнае імкненне набыць трывалыя веды. «Ніхто за вушы ў выдатнікі не цягне. Здольныя ад прыроды да навукі ў пяцёрачнікі выб'юцца самі». З пазіцый выпускнікоў растлумачвае Г. Марчук іх спакой перад экзаменамі і адзначае, што «нервуюцца больш бацькі, бо дзеці добры год ужо ходзяць парамі». Эпізоду пра апошні званок папярэднічае паведамленне, што пад страхой школы ластаўка вывела птушанят: кажуць, што Бог асабліва аберагае тую школу, дах якой дае прытулак ластаўкам. З іншага боку, ніщто так не зневажае школу, як адсутнасць званкоў і дзіцячых галасоў. Гэта адзін з першых сігналаў нейкай катастрофы ў прыродзе ці грамадстве. Таму школа з цёмнымі вокнамі, нават у час звычайных летніх канікул, заўсёды абуджае трывогу.

«Ад званка да выпускнога, — разважае пісьменнік, — адзін крок... Заўтра воля. Не, сёння воля!.. Бывай, школа!» Заўтра будзе інстытут, тэхнікум ці вучылішча, але не будзе побач тых, хто з табою сёння, хто прывучыў рабіць дабро іншаму... Таму сонца, узыходзячы, не-не ды і адаб'ецца ў чыёй-небудзь сарамлівай слязінцы. Надзвычай пераканаўча гучаць наступныя аўтарскія словы: «Не шукайце сабе новых сяброў, лепшых за школьных, іх усё адно не будзе».

**«Канон Маці»** Г. Марчук пачынае так, як маглі б пачаць свой ліст да самага дарагога чалавека многія: «Я ад цябе далёка, у другім горадзе...» Але ўслед ідуць шчымліва-безнадзейныя словы: «...калі б ты прыйшла на некалькі хвілін адтуль, адкуль ніхто не вяртаецца...» Лейтматывам твора

Репозиторий БарГУ

гучыць радок: «Мамо, не було дня, коб я не ўспамінаў цябе». Гэты канон адрозніваецца ад папярэдніх тым, што ён — дыялог, уяўлены аўтарам, хутчэй маналог, адрасаваны ў вечнасць. Гэта вызначае танальнасць твора. Ён прасякнуты журботнай удзячнасцю да Той, што прыняла сына «на Божы свет, узяла за руку, паказала вуліцы, царкву... магілы продкаў».

Герой Г. Марчука разгортвае перад чытачом своеасаблівы сямейны альбом свайго роду. З яго старонак паўстаюць аблічы тых, хто прыйшоў у гэты свет пасля заўчаснай смерці яго маладой маці, якая па зямных мерках стала ўжо прабабуляй, — цяпер яе імя носіць праўнучка. Аднак маці не пазнала б не толькі сваіх новых родзічаў. Даўно няма старой хаты, а на месцы, дзе яна стаяла, пабудавалі камяніцу чужыя людзі. Увогуле жыццё гарадчукоў шмат у чым змянілася. Адрадзілася царква, гарадок адсвяткаваў сваё дзевяцісотгоддзе і ўпрыгожыўся велічным помнікам князю Давыду. На жаль, менш нараджаецца дзяцей. Але нейкія спрадвечныя жыццёвыя традыцыі засталіся непарушнымі. «Па-ранейшаму ўсе гандлююць насеннем і гуркамі. Гоняць кароў на пашу ды моляцца, каб быў ураджайны на бульбу год».

Герой «Канона Маці» прызнаецца, што часам не слухаўся яе, але не раскайваецца ў гэтым. Бо гаворка ідзе не пра звычайную непаслухмянасць дзіцяці, а пра тое, што шукаў выйсця талент, які маці не паспела разгледзець... «Ты сварылася: "Не прыдумляй, сынок, кажы праўду, біць не буду". А я прыдумляў і стаў пісьменнікам». Пісьменнік падарыў сваёй маці бессмяротнасць, бо яе аблічча, «партрэт і характар», тымі ці іншымі рысамі заўсёды прысутнічае ў яго творах як самая важная частка роднага свету, з якім герой не хацеў бы разлучацца і пасля заканчэння свайго зямнога шляху.

Праз асэнсаванне трагедыі ўласнага дзяцінства Г. Марчук уздымаецца да роздуму над вечнымі пытаннямі жыцця чалавека, ад клопатаў яго зямнога існавання да адчування іншабыцця ў вечнасці. Яно ўяўляецца найперш як магутны ўплыў энергетыкі продкаў і таго кутка, дзе чалавеку наканавана было з'явіцца на свет. Пісьменнік дзеліцца ўласным разуменнем таго, што шлях да вечнасці ляжыць праз удзячную памяць. Заключная частка «Канона Маці» гучыць



Рэпазіторый БарДУ

як запавет: «Хачу... каб палажылі ў роднай зямельцы на старэнькіх могілках, якія маўкліва ахоўваюць продкі: жвавы дзед, сціплая бабуля, ласкавая маці, працавітыя дзядзькі ды ўвішныя цёткі»; каб «паклалі ля царквы, каб хоць духам, ценем, а ўсё быць бліжэй да Гарыні хуткаплыннай, Царкоўнай гары, роднай вуліцы». Чалавеку хочацца, каб заўжды было побач усё тое, «вечна зменлівае і пастаяннае ў нязменнасці», што «ўтварыла характар, паўплывала на пачуцці і замацавала адметнае». І на першы погляд нечаканым дысанансам гучыць аўтарскае: «Не хачу... не хачу...», якое тут жа напаўняецца сэнсам: «...паміраць не хачу!». Бо хочацца працягваць рабіць дабро, наталяць душу добрым і прыгожым, прызнавацца ўсяму жывому ў каханні... І таму жаданне жыць — мацнейшае за ўсе астатнія жаданні.

Тэма сакральнага, святога няпростая для кожнага творцы. У «Каноне Богу» Г. Марчук раскрывае сутнасць узаемаадносін чалавека і Бога праз асаблівасці веры сваіх улюбёных землякоў, жыхароў Давыд-Гарадка. Але гэтая мадэль бачання свету ў большасці яе рыс уласціва ўсяму народу Беларусі і нават выходзіць за яе межы. На пачатку твора пісьменнік дае адчуць, як непарыўная «еднасць Бога, людзей, хат, вуліц» штодня перадаецца пры дапамозе звыклых маўленчых формул: «Дапамажы, Божа», «Уратуй, Госпадзі», «Бог у помач» і многіх іншых. Самы страшны праклён — «Каб цябе Бог пакараў», самае сардэчнае пажаданне — «Каб цябе Бог любіў». Пра іх сэнс сучасны чалавек наўрад ці задумваецца, але традыцыйна звяртаецца да іх «магіі» ў складаныя моманты свайго жыцця. У той жа час прымавак, звязаных з чортам, гарадчукі не ўжываюць. Яны кіруюцца правілам: «лепш быць далёкім сваяком Бога, чым самым блізкім суседам чорта». Г. Марчук адзначае: нават усюдыіснае тэлебачанне, штодня нараджаючы новых куміраў, не пахіснула тысячагадовай хрысціянскай свядомасці, не разбурыла рытуалаў жыцця. Хоць не ўсе адпавядаюць боскай сутнасці, але ўсе ведаюць пра існаванне Бога і захоўваюць традыцыі, перадаючы іх з пакалення ў пакаленне.

Апавядаючы пра сваіх землякоў, Г. Марчук звяртае ўвагу на тое, што ў дні царкоўных свят людзі робяцца дабрэйшымі, стрымліваюць свае крыўды, а часам і злосць. Боская

Рэпазіторый БарДУ

присутнасць робіцца ў такія дні найбольш адчувальнай, і не толькі таму, што аб ёй нагадвае «па-мясцоваму сціплы, але ўсё ж такі ўрачысты голас званоў». Ён кліча гарадчукоў да царквы, дзе яны будуць бліжэй да Бога і да людзей, суседзяў і сяброў, — тых, каго ў такія хвіліны хочацца адчуць поплеч. Тут не знойдзеш хаты, у якой не было б абразоў на покуці.

Бог для беларусаў, пісаў Кандрат Крапіва, — гэта хутчэй «...селянін у сусветным маштабе, руплівы і працавіты... увесь час заняты рознымі гаспадарчымі абавязкамі». У «Каноне Богу» таксама адбілася гэтае адметнае ўяўленне. Г. Марчук піша: «Бог успрымаецца не як байка, а як добры чалавек, які пастаянна сочыць за кожным». Гарадчукі вераць, што з Богам жыць лягчэй і больш надзейна. Асабліва ж бачыцца ім Боская рука ў квецені садоў, на якія багаты гарадок.

Вера гарадчукоў у Бога цесна звязана з іх любоўю да сваёй «малой радзімы». Часта можна пачуць ад таго ці іншага чалавека словы, падобныя гэтым: «Бог мяне сюды прывёў, тут і жыць буду». Часта, заўважае пісьменнік, за тысячу кіламетраў едуць дадому, каб разам з усёй сям'ёй сустрэць Вялікдзень. Такая моцная прывязанасць да роднай зямлі спрадвеку была ў душы беларускага народа.

Георгій Марчук, аднак, разумее, што моладзі ўласцівы «недавер, сумненні, легкадумнасць і ў адносінах да Бога». І сцвярджэнне аўтарам таго, што ў боскую прысутнасць вераць і старыя, і малыя, а без «благаславення і крыжа не выбіраюцца ў далёкую дарогу, не пачынаюць ніякай справы, не сядаюць да стала», у большай ступені адносіцца да часоў яго маленства. Сёння ж старым крыўдна, «што вера ўжо не такая моцная і прачулыя казанні святара слухаюць без належнай пашаны». Але тых і другіх яднае ўпэўненасць, што няма такога чалавека на зямлі, якому б Бог не дапамог. «З тым у душы і жывуць», і гэта ўзмацняе жыццёвы аптымізм пісьменніка.

---

1. У чым вы бачыце адметнасць жанру, якому Г. Марчук даў вызначэнне «канон»?
2. Удумайцеся ў назвы навел. Абгрунтуйце, чаму аўтар абраў менавіта такіх, а не іншых «адрасатаў» для сваіх «канонаў».
3. У чым ідэйна-мастацкая сувязь «Канона Гарыні» і «Канона Вуліцы»?



Рэпазіторый БарДУ

4. На аснове тэксту навелы «Канон Вуліцы» складзіце «Кодэкс Вуліцы», кіруючыся наступным азначэннем: *кодэкс* — сукупнасць асноўных правілаў, перакананняў.
5. У якім аўтарскім выказванні ўтрымліваецца ідэя «Канона Школе»? Абгрунтуйце сваё меркаванне.
6. Вызначце ў «Каноне Школе» ролю прытчы аб дрэве.
7. Складзіце «партытуру» пачуццяў, увасобленых у аўтарскім аповедзе аб школе. Ці маглі б вы назваць гэтую навелу «Канон маёй школе»? Калі так, то чаму?
8. Як у «Каноне Маці» аўтар спраўджвае яе запавет «Прызнавайся ўсяму жывому ў каханні...»?
9. У Бібліі гаворыцца аб чалавеку так: «Сеецца цела душэўнае, паўстае цела духоўнае... Не духоўнае перш, а душэўнае». Знайдзіце ў тэксце «Канона Богу» выразы, якія сведчаць пра веруючага беларуса-гарадчука як пра чалавека «душэўнага».
10. Які працяг, паводле зместу навелы «Канон Богу», можа мець асацыятыўны рад слоў «Бог, вера, сумленне...»?

Репозиторий БарГУ